Цана 10 кап. (грош.)

Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 12
5 кастрычніка 1939 г.
Чацвер

Усю памешчыцкую зямлю — сялянам

Дні ўсенароднай радасці перажываюць зараз працоўныя свабоднай Заходняй Беларусі.

У цяжкія часы, калі народ Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны яго неразумнымі кіраўнікамі быў уцягнут у крывавую вайну, совецкі народ — багатыр рашыў працягнуць сваім братам магутную руку брацкай дапамогі.

Авеяная славай, доблесная Рабоча-сялянская Чырвоная Армія, выконваючы загад галоўнага камандавання, перайшла граніцу і ўзяла пад абарону жыццё і маёмасць нашых адзінакроўных братоў-беларусоў. З радасцю і лікаваннем сустракалі працоўныя вёсак і мястэчак, гарадоў Чырвоных воінаў.

Польскія паны за ўвесь час свайго гаспадарання многія тысячы сялянскіх гаспадарак беларусоў давялі да поўнага разарэння. Тысячы, дзесяткі і сотні тысяч сялян былі асуджаны на голад і жабрацтва.

Сяляне Заходняй Беларусі былі даведзены польскімі панамі да выключнага малазямелля. 250 памешчыкаў Віленска - Трокскага уезда мелі ў сябе 80 тыс. га ворнай зямлі, у той час як 60 тыс. сялян мелі усяго толькі каля 210 тысяч га.

У гарадах і вёсках Заходняй Беларусі пачалося новае кіпучае жыццё. Мільёны працоўных прыступілі да пабудовы жыцця на новы лад, адчулі сябе свабоднымі, выпрасталіся ва ўсю постаць і вольна ўздыхнулі.

Нармальнае жыццё ў вёсках пачынае біць ключом. Створаны сялянскія камітэты, якія наводзяць парадак у землекарыстанні, захоўваюць грамадскі парадак, ахоўваюць маёмасць памешчыцкіх маёнткаў, прыступілі паўсямесна да раздзела памешчыцкай зямлі і маёмасці маёнткаў сярод сялян.

Вось к прыкладу сяляне акружаючых маёнтак Каменка пана Матвеева вёсак, раздзялілі паміж сабой памешчыцкую зямлю. Кожны ўзяў сабе зямлі столькі, колькі яму патрэбна.

Сялянскі камітэт раздаў сялянам вёсак маёмасць, сельскагаспадарчы інвентар і зямлю памешчыка маёнтка Варняны. Сяляне Урбановіч Я., Садоўскі В., Цехановіч С., Пілецкі Ф. атрымалі па 7,5 га зямлі і па рабочаму каню з вупражжу і інвентаром. Селянін Шляхтовіч Б. атрымаў з маёнтка Мане 6 га ворнай зямлі, 2 кароў, 1 каня. Такіх прыкладаў можна было прывесці многа. Але і вышэйпрыведзеныя сведчаць аб тым, што сялянскія камітэты ў большасці мейсц правільна зразумелі свае задачы і ўзяліся ў першую чаргу за навядзенне парадку ў землекарыстанні.

Пярвейшай і адказнейшай задачай ўсіх сялянскіх камітэтаў з'яўляецца раздача ўсіх памешчыцкіх зямель сялянам. Трэба таксама раздаць сялянам увесь сельска-гаспадарчы інвентар, жывёлу маёнткаў памешчыкаў.

Пры раздачы памешчыцкай зямлі павінна быць захавана асноўное правіла—усе ворныя землі павінны быць выкарыстаны і нельга дапускаць, каб пуставаў хоць адзін гэктар ворыва. Трэба неадкладна навясці парадак у лясах і бязумоўна забараніць самаўласную вырубку лесу. Такія дзеянні трэба разглядаць як расхішчэнне народнай маёмасці. Чэсным людзям павінна быць даручана ахова народнага багацця — лясоў, маёмасці панскіх маёнткаў.

Перад сялянскімі камітэтамі стаяць важныя і ганаровыя задачы. Неадкладна ўсе камітэты павінны разгарнуць шырокую работу ў масах сялян і ў бліжэйшыя дні поўнасцю раздаць усю памешчыцкую зямлю і маёмасць маёнткаў сялянам.

За работу таварышы! Прыложым усе сілы к таму, каб хутка выканаць пастаўленыя перад сялянскімі камітэтамі задачы. Уся памешчыцкая зямля павінна быць перадана ў карыстанне сялянам!



Удзельнікі 1-ай нарады сялянскіх камітэтаў Віленска-Трокскага уезда члены сялянскага камітэта вёскі Скубяты, Мала-Солечнікоўскай воласці т.т. Пухавецкі, Жыніс і Адамкевіч.
Фото Дабравольскага.

ПЕРШАЯ НАРАДА СЯЛЯНСКІХ КАМІТЭТАЎ ВІЛЕНСКА-ТРОКСКАГА УЕЗДА

Жыццё сялян стала свабодным і шчаслівым

Учора ў тэатры «Лютня» адбылася нарада старшынь і членаў сялянскіх камітэтаў Віленска-Трокскага уезда. На нарадзе прысутнічала 250 старшынь і членаў валасных і сялянскіх камітэтаў, члены троек з маёнткаў.

Адкрываючы нараду, прадстаўнік Часовага Упраўлення тав. Любімаў указаў, што гераічная Чырвоная Армія з чэсцю выканала свой доўг перад працоўнымі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, вызваліўшы іх ад векавечнага іга польскіх паноў, ад эксплаатацыі памешчыкаў і капіталістаў. Прысутныя доўга апладыруюць сваёй вызваліцельніцы, — Чырвонай Арміі, Совецкаму Ураду і роднаму бацьку таварышу Сталіну.

Упершыню за 20 год прадстаўнікі сялян вольнай краіны, без паноў і памешчыкаў сабраліся вырашаць свае жыццёвыя пытанні.

У прэзыдыуме — батракі Сенюц Андрэй, Гурко, сяляне Новасадаў, Пашкевіч і інш. Усе яны ўпершыню знаходзяцца ў тэатры, першы раз у сваім жыцці на такім многалюдным сходзе.

З дакладам аб задачах сялянскіх камітэтаў выступіў намеснік старшыні Віленска-Трокскага павета тав. Турко.

— Усе тут сабраўшыяся,—гаворыць дакладчык, з'яўляюцца прадстаўнікамі свабоднага народа, вызваленага Чырвонай Арміей з бяды і галечы.

Дакладчык прыводзіць яркія лічбы, якія сведчаць аб пакутным жыцці абяздоленага сялянства ў Заходняй Беларусі ў часы гаспадарання тут польскай шляхты. Па Віленска-Трокскаму павету 250 памешчыкаў мелі 80 тыс. га зямлі. На кожнага памешчыка ў сярэднім прыпадала каля 400 га ворнай зямлі.

У той жа час 60 тыс. сялянскіх гаспадарак мелі ўсяго 210 тыс. гектараў самай горшай зямлі. На гаспадарку прыходзілася ўсяго каля 3 га зямлі. Акрамя таго многа тысяч сялянскіх гаспадарак мелі толькі па 1 гектару і вялікая колькасць сялян зусім былі пазбаўлены зямлі.

Выбіраючы свае камітэты, сяляне даручылі Вам адказную справу. Яны выказвалі на сходах аднадушнае жаданне навясці неабходны парадак у землекарыстанні.

Вось над вырашэннем гэтых задач і павінны працаваць усе нашы сялянскія камітэты. Трэба, каб неадкладна была праведзена перадача ўсёй памешчыцкай зямлі сялянам. Усе, хто жадае атрымаць зямлю павінны ўзяць яе столькі, колькі ім патрэбна.

Многія камітэты і сяляне вёсак прыступілі да падзелу памешчыцкай зямлі. Вось селянін Пілецкі Ф. з маёнтка Варняны ўзяў 7,5 га зямлі і атрымаў каня. Па 7,5 гектараў пахатнай зямлі атрымалі з гэтага маёнтка сяляне Урбановіч Ф., Садоўскі В., Цехановіч С.

Так павінны паступіць і сяляне ўсіх вёсак, узяць памешчыцкую зямлю і апрацоўваць яе па-гаспадарску. Камітэты абавязаны дапамагчы ў гэтым сялянам.

Тав. Турко паставіў і рад іншых практычных задач работы сялянскіх Камітэтаў у галіне аховы маёмасці памешчыцкіх маёнткаў, памяшканняў, лясоў. Трэба да ўсяго адносіцца, як да народнага багацця і берагчы яго ад раскрадвання і псавання.

Бурнымі аплодысментамі і прывітальнымі воклічамі сустрэлі сабраўшыяся здравіцу ў чэсць Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і вялікага правадыра працоўных таварыша Сталіна.

Дакладчыку было задана многа пытанняў. Сяляне, члены камітэтаў, запытвалі, як прыступіць да раздзела зямлі, як арганізаваць ахову леса і т. д.

Затым разгарнуліся ажыўлёныя спрэчкі. Адзін за другім на трыбуну падымаліся прадстаўнікі свабоднага сялянства, члены і старшыні сялянскіх камітэтаў. У кожным выступленні адчувалася вялікая радасць за сваё вызваленне.

Усе, як адзін, выступаўшыя выказвалі сваю цвёрдую ўпэўненасць, што яны, як і ўсё сялянства, гатовы прылажыць свае сілы на тое, каб з поспехам выканаць стаячыя перад імі задачы па ўмацаванню рэволюцыйнага парадку. Выступаўшыя гаварылі, што для ўсяго сялянства Заходняй Беларусі няма і не можа быць большай радасці і шчасця, як жыць і працаваць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, ў брацкай дружнай сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза.

Соль, керасін і табак для Заходняй Беларусі

Гутарка са Старшынёй Совета Народных Камісараў БССР таварышам Кісялёвым.

У гутарцы з карэспандэнтам БелТА Старшыня Совета Народных Камісараў БССР Кісялёў, які прыехаў з Заходняй Беларусі, сказаў наступнае:

— Усюды, дзе мне ні прыходзілася бываць, у гарадах і вёсках, насельніцтва адчувае вострую патрэбу ў таварах першай неабходнасці: солі, керасіне, махорцы, запалках і іншых. Незадачлівыя былыя гаспадары панскай Польшчы, на працягу некалькіх месяцаў, не снабжалі раёнаў Заходняй Беларусі неабходнымі таварамі. Вызваленыя працоўныя Заходняй Беларусі ў першую чаргу прасілі аб арганізацыі снабжэння іх гэтымі таварамі.

Выходзячы з гэтага, рашэннем Эканомсовета пры СНК СССР, выдзелены і накіраваны ў гарады і вёскі Заходняй Беларусі наступныя тавары: 6 тысяч тон солі, 700 тон керасіну, 5 тысяч скрынак запалак, 7.150 скрынак махоркі.

Для лепшай арганізацыі гандлю ў гарадах: Вільно, Беласток, Брэст-Літоўск, Пінск, Баранавічы, Ваўкавыск, Ліда, Маладэчна і Паставы арганізуюцца оптавыя базы, праз якія Часовыя Упраўленні будуць размяркоўваць выдзеленыя тавары па ўсіх населеных пунктах, выходзячы з колькасці насельніцтва.

Гандаль будзе праходзіць праз існуючыя магазіны, належачыя прыватнікам, пад непасрэдным кантролем Часовых Упраўленняў. Ва ўсіх пунктах ўстанаўліваюцца адзіныя розьнічныя цэны. У прыватнасці цана на соль ўстаноўлена 30 грошай (капеек) за кілаграм, махорку—50 грошай за 50 грам, керасін ў горадзе—65 грошай за літр, у вёсцы—66 грошай.

Гэта новае мерапрыемства па аказанню дапамогі родным братам Заходняй Беларусі сустрэта насельніцтвам з вялікай радасцю.
(БелТА)

—:::—

Пашпарт Масквы

Цэнтральнае Упраўленне Народна-Гаспадарчага Учота Дзяржплана СССР праводзіць пашпартызацыю гарадоў СССР. У гэтым годзе заканчваецца работа па 220 найбольш буйных гарадах. Пашпарты іх пачалі паступаць зараз у Цэнтральнае Упраўленне Народна-Гаспадарчага Учота. Атрыман, у прыватнасці, пашпарт сталіцы СССР.

У графах і раздзелах пашпарта дадзены вычарпальныя звесткі аб гісторыі ўзнікнення сталіцы Совецкага Саюза, колькасці насельніцтва, развіцці прамысловасці, росце тэрыторыі і т. д.

Масква — буйнейшы культурны цэнтр. Тут налічваецца 82 вышэйшыя навучальныя ўстановы, у якіх к 1 студзеня 1939 г. навучалісь 94.987 студэнтаў. Акрамя таго, на 105 курсах падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі спецыялістаў навучалась 52.695 чалавек. Да пачатку 1938-39 навучальнага года ў сталіцы было 629 пачатковых, няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ з 602.167 навучаючымі ся, мноства тэхнікумаў, школ ФЗУ, агульнаадукацыйных школ для дарослых і т. д.

Шырока разгорнута ў Маскве сетка ўстаноў аховы здароўя: 157 бальніц і радзільных дамоў з 27.592 койкамі (да рэволюцыі было 44 бальніцы на 8.323 коек), 427 урачэбных пунктаў на прадпрыемствах, 448 амбулаторый і паліклінік, 325 пастаянных дзецкіх яслей і т. д. У горадзе налічвалась 29 стадыёнаў, 38 лыжных станцый і трамплінаў, 9 водных станцый.

Пашпарт Масквы дае таксама багатыя даныя аб прамысловасці сталіцы, транспарце, жыллёвым фондзе, гандлю, бюджэце і т. д.
(ТАСС).

У апошнюю мінуту

Прабыване міністра замежных спраў Турцыі п. Шукру Сараджоглу ў Маскве

Прыём маршалам Совецкага Саюза, Наркомам Абароны СССР т. К. Е. Варашылавым п. Шукру Сараджоглу

3 кастрычніка г. г. маршал Савецкага Саюза, Нарком абароны СССР таварыш К. Е. Варашылаў прыняў міністра замежных спраў Турцыі п. Шукру Сараджоглу у суправаджэнні надзвычайнага і поўнамоцнага пасла Турцыі п. Алі Хандар Актай.

Пры прыёме прысутнічаў поўпрэд СССР у Турцыі тав. А. В. Терэнцьеў.

Прыём Наркомам знешняга гандлю СССР тав. А. І. Мікаянам п. Шукру Сараджоглу

3 кастрычніка г. г. Народны камісар знешняга гандлю Саюза ССР тав. А. І. Мікаян прыняў міністра замежных спраў Турцыі п. Шукру Сараджоглу ў суправаджэнні надзвычайнага і поўнамоцнага пасла Турцыі п. Алі Хайдар Актай. Пры прыёме прысутнічаў поўпрэд СССР у Турцыі тав. А. В. Терэнцьеў.

*

4 кастрычніка г. г. міністр замежных спраў Турцыі п. Шукру Сараджоглу наведаў Маўзалей Леніна і ўсклаў вянок.

Паведамленне вярхоўнага камандавання германскай арміі

БЕРЛІН, 4 кастрычніка (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі апублікавала наступнае паведамленне: «На ўсходзе ў часе ачысткі тэрыторыі, расположанай паміж быўшай дэмаркацыйнай лініяй і новай граніцай паміж дзяржаўнымі інтарэсамі Германіі і СССР, мелі месца баі з разрозненымі часцямі быўшай польскай арміі.

На захадзе за выключэннем слабага агню артылерыі праціўніка ў раёне Саарбрукена панавала зацішша.

З 30 верасня германскія ваенна-марскія сілы затрымалі 72 замежныя параходы. Частка з гэтых судоў, перавазіўшых кантрабандныя грузы, адведзена ў германскія парты».

ГАСПАДАРОМ ЗЯМЛІ СТАЎ ПРАЦОЎНЫ НАРОД

на нарадзе сялянскіх камітэтаў Віленска-Трокскага ўезда

Дзякуй Сталіну за свабоднае, шчаслівае жыццё

Таварышы! Дзень прыхода Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі для нас, працоўных Заходняй Беларусі, быў днём самым шчаслівым і радасным.

Больш поўвека гнуў я перад панам спіну. Не было таго дня, каб я не атрымаў ад пана аплявухі або сіняка пад вачыма.

Усё жыццё я збіраў грошы, каб купіць хоць якога-небудзь каня, але я гэтага не мог зрабіць. Увесь час жыў без каня і каровы.

Першага кастрычніка сяляне нашай вёскі выбралі мяне ў сялянскі камітэт. Я вельмі рад, што мне даручылі гэту вялікую і адказную работу.

Наш камітэт з першых дзён арганізацыі стаў адчуваць у вёсцы. Мы раздалі ўжо 200 га панскай зямлі, 17 кароў, 11 коней, 9 свіней і 12 авечак. Коні атрымалі беднякі і батракі: Ермін Ведаслаў, Гурскі, Эдвард Дуданец і інш.

Зараз мы арганізавалі малацьбу і раздачу панскага збожжа батракам. Канчаем капаць бульбу.

Адным словам жыццё пайшло па-новаму. Усе мы вольна ўздыхнулі. Вялікае дзякуй совецкаму народу і правадыру ўсіх працоўных таварышу Сталіну за свабоднае, шчаслівае жыццё.

Гурскі Осіп,
член сялянскага камітэта
мястэчка Гервяты

—:::—

Будзем пільнымі


Ілья Свірскі—старшыня Міхалішкінскага валаснога камітэта.

Мы дажылі да таго светлага часу, калі несправядлівасць, дзікія здзекі кончыліся раз і назаўсёды. Чырвоная Армія вызваліла нас з-пад іга прыгнёту і парабашчэння.

Але сляды дваццацігадовага панскага гнёту засталіся яшчэ. Паны і падпанкі дзе-нідзе сядзяць пры таўшыся і спрабуюць шыпець са сваіх нор, як ядавітыя гадзюкі. З гэтымі ваўкамі ў авечых скурах нам трэба павясці рашучую барацьбу і не дапусціць іх у сялянскія камітэты. А ў радзе месц гэтыя людзі пралезлі ў склад камітэтаў і будуць нам пакасціць на кожным кроку.

На выбарах камітэтаў сяляне нам даверылі вялікую справу, выказалі сваё давер'е. Наша задача састаіць ў тым, каб апраўдаць давер'е народа.

Будзем цесна трымаць сувязь з масамі і служыць гэтым масам. Сялянскія камітэты павінны арганізаваць сваю работу так, каб забяспечыць навядзенне парадка ў землякарыстанні, навясці парадак у вёсках і мястэчках. Наша задача — добра падрыхтавацца да таго знамянальнага часу, калі мы станем грамадзянамі вялікага Совецкага Саюза.



Група ўдзельнікаў 1-ай нарады сялянскіх камітэтаў Віленска-Трокскага ўезда чытаюць газеты

Фото Дабравольскага

Жывем вольна без польскіх паноў

Ковасадаў Кірыл Іванавіч

Старшыня Падбярэзскага валаснога камітэта

Доблесная гераічная Чырвоная Армія вызваліла ўсе народы, населяючыя Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, ад векавога памешчыцкага гнёту. Зараз мы больш як 15 дзён жывём вольна, без польскіх паноў і памешчыкаў. Зямля і ўсе багацці, вытвараныя потам і крывавымі мазалямі працоўных, адабраны ў паноў-крывапіўцаў.

Хопіць панам жыць і нажывацца чужой працай. Гаспадарамі зямлі і багаццяў сталі мы — працоўны народ.

Як толькі Чырвоная Армія аслабаніла сялян ад панскага іга, у нашай воласці быў створан Валасны сялянскі камітэт. У яго ўвайшлі чэсныя, ініцыятыўныя людзі. З першых дзён, камітэт па сапраўднаму ўзяўся за наладжванне нармальнай работы. Мы адразу ўзялі на ўчот усю панскую маёмасць, арганізавалі раздачу зямлі сялянам. Камітэт раздаў ужо больш 1000 га.

Вялікую ўвагу наш камітэт звяртае на кантроль. Мы даручылі сваім членам камітэта сачыць за тым, каб маёмасць не была раскрадзена. Устанавілі варту над будынкамі.

Магу запэўніць усіх прысутных на нарадзе, што мы разам з усімі працоўнымі сялянамі нашай воласці зробім усё неабходнае для радаснага, шчаслівага і культурнага жыцця.

Няхай жыве непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве вялікі вызваліцель таварыш Сталін!

—:::—

З радасцю будзем працаваць у брацкай сям'і народаў СССР

Блажэвіч — член Салечнікаўскага валаснога камітэта

Дваццаць год мы жылі пад гнётам польскіх паноў.

Памешчыкі і чыноўнікі панскай Польшчы душылі селяніна ўсімі мерамі і спосабамі. Не так на кані едзеш — плаці штраф, у панскі лес зайшоў — штраф, сабака перабяжыць дарогу пану — ізноў штраф.

Нельга было адбіцца і ад усякіх падаткаў, якія вялікім цяжарам ляжалі на плячах сялян.

За падаткі і за ўсякія кары ў селяніна забіралася апошняя жывёліна. Нават апошнюю падушку забіралі з хаты. Нельга было нікому ні паскардзіцца, ні аб горы сваім расказаць.

І вось мы дачакаліся таго часу, калі перад намі шырока адкрываюцца шляхі свабоднага радаснага жыцця.

Не бываць больш у нашых вёсках, у сялянскіх хатах гору і нястачы!

Вялікую радасць і новае жыццё прынесла нам Чырвоная Армія і мы будзем даражыць ім, як сваім вокам.

Наш камітэт пачаў сваю работу. Мы наладзілі ахову лясоў і маёмасці памешчыцкіх маёнткаў. Усё гэта зараз з'яўляецца народным дастаяннем, багаццем усяго сялянства. Таму і ахоўваць і берагчы гэта дабро трэба як сваё роднае.

З вялікай радасцю сялянства сустрэла прыход Чырвонай Арміі. Бо толькі Чырвоная Армія здольна ахоўваць кроўныя інтарэсы народа і мы з чэсцю будзем жыць і працаваць у брацкай дружнай сям'і вялікага совецкага народа.

Чэсць і слава Чырвонай Арміі

Іван Пашкевіч — член сялянскага камітэта м. Рудзішкі

У такія радасныя дні, якія перажываюць зараз працоўныя вызвалены ад гнёту памешчыкаў і капіталістаў Заходняй Беларусі, хочацца ўспомніць зусім недалёкае праклятае мінулае.

Нам і нашым дзецям у школах заўсёды гаварылі, што Совецкі Саюз самая слабая дзяржава. Мы ведалі, што ўсё гэта голая хлусня, але адкрыта сказаць аб гэтым нельга было. За гэта саджалі ў турмы і канцлагеры.

Абяздоленыя сяляне доўгі час чакалі свайго вызвалення. І гэты шчаслівы час настаў. Мы зараз сваімі вачыма ўбачылі, што такое Чырвоная Армія і чым яна ўзброена.

У вёсках мы сустракалі Чырвоную Армію як сваю вызваліцельніцу, як родных і блізкіх братоў. Сяляне ведаюць, што толькі совецкі народ і яго гераічная Чырвоная Армія дасць нам свабоду і шчасце.

У вёсцы пачалося новае жыццё. Адразу мы адчулі, што мы людзі, а не жывёліна, як нас лічылі польскія паны.

Сяляне забралі зямлю памешчыкаў і пачынаюць на ёй гаспадарыць.

За аказаную совецкім народам брацкую дапамогу працоўным Заходняй Беларусі аддзякам сумленнай работай на карысць Совецкага Саюза. Будзем мацаваць сілу і магутнасць Совецкага Саюза разам са ўсім дружным совецкім народам.

Ад усяго сэрца мы пасылаем словы ўдзячнасці роднаму бацьку нашаму таварышу Сталіну. Чэсць і слава гераічнай Чырвонай Арміі — нашай вызваліцельніцы!

(Бурныя апладысменты. Воклічы «Ура таварышу Сталіну»).

—:::—

З рэзалюцыі нарады сялянскіх камітэтаў Віленска-Трокскага ўезда ад 4.X.39 г.

Нарада членаў сялянскіх камітэтаў Віленска-Трокскага ўезда, заслухаўшы даклад прадстаўніка Часовага Упраўлення аб задачах сялянскіх камітэтаў, горача вітае Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію—вызваліцельніцу народаў Заходняй Беларусі з-пад гнёту польскіх паноў, памешчыкаў і жандараў.

Прагнаўшы памешчыкаў, гэтых драпежных эксплаататараў і прыгнятальнікаў сялянства, Чырвоная Армія дала магчымасць нам вырашыць асноўнае пытанне аб зямлі.

Ідучы насустрач патрабаванням шырокіх мас сялянства, нарада заклікае сялянскія камітэты ў бліжэйшы перыяд правясці наступныя мерапрыемствы:

1) Правясці раздачу ўсіх памешчыцкіх зямель як ворных, так і сенажацей, пасбішчаў і лясоў сялянам згодна іх патрабаванням.

2) Задаволіць патрабаванні сялян, не маючых коней, сельска-гаспадарчага інвентара і безкароўных сялян шляхам раздачы ім коней, кароў, авечак і інвентара з памешчыцкіх маёнткаў.

3) Сялянскія камітэты і рабочыя тройкі ў маёнтках бяруць на сябе абавязак у бліжэйшыя дні закончыць уборку бульбы, гароднiны з памешчыцкіх маёнткаў, забяспечыўшы тым самым бедных сялян і працоўных горада бульбай і гароднінай.

4) Улічваючы, што значная частка сялян, а таксама бьіўшых батракоў маёнткаў не маюць насення для азімай сяўбы, нарада абавязвае паскорыць абмалот і раздачу ім насення жыта з памешчыцкіх маёнткаў.

5) Нарада лічыць неабходным аказаць дапамогу часцям нашай роднай Чырвонай Арміі і працоўным горада Вільно шляхам падвозу прадуктаў харчавання ў горад з маёнткаў.

6) Чарговай задачай сялянскіх камітэтаў з'яўляецца наладжванне нармальнага жыцця ў вёсцы, для чаго неабходна прыняць меры к бесперабойнаму гандлю ў вёсках, к падвозу прадуктаў з вёскі ў горад для продажу.

7) Забяспечыць пачатак заняткаў ва ўсіх школах, забяспечыць іх дровамі.

8) Нарада лічыць, што для аховы рэвалюцыйнага парадку ў вёсках і барацьбы з нарушальнікамі нармальнага жыцця (рабаўніцтва, хуліганства, спекуляцыя і т. д.). неабходна ўмацаваць ужо створаныя атрады рабочай гвардыі і аказваць ім штодзённую дапамогу.

9) Нарада паручае сялянскім камітэтам захаваць, як жыллёвыя, так і гаспадарчыя памяшканні былых маёнткаў з тым, каб скарыстаць іх на патрэбы саміх сялян.

Нарада выражае ўпэўненасць, што сялянскія камітэты выбраныя сялянамі і батракамі маёнткаў, выканаюць волю і патрабаванні сялянства аб хутчэйшым раздзеле памешчыцкіх маёнткаў і будуць сапраўднымі органамі захавання рэвалюцыйнага парадку ў вёсках.

Польскія паны ў барацьбе

з беларуска-украінскай культурай у XVI—XIX вяках

Адной з асноўных прычын развала польскай дзяржаўнасці з'явілась жорсткае прыгнечанне украінскага і беларускага народаў — прыгнечанне, якое трымалася вякамі і скінута толькі нашай Чырвонай Арміяй — вызваліцельніцай прыгнечаных.

Панская Польшча XVI—XIX вякоў і капіталістычная Польшча 1919—39 гадоў бязлітасна і груба знішчалі народную культуру ў Беларусі і Украіне, праследвалі рускую мову, палілі ўкраінскія і беларускія кнігі, ганьбілі і залівалі крывёю землі народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Аднак, нягледзячы на гэта, брацкія нам народы змаглі пранесці скрозь стагоддзі і зберагчы сваю родную мову, сваё мастацтва і сваю культуру.

Польскія паны і польскія буржуазныя вучоныя, усяляк фальсіфіцыруючы гістарычныя факты упорна імкнуліся даказаць, што руская культура і яе ўздзейнічанне зніклі ў Заходняй Украіне яшчэ ў XVI—XVIII вяках. Так, у віленскім музею ўжо ў сярэдзіне XIX века ўсе экспазіцыі будаваліся на паказе толькі польскага і літоўскага рэчавага матэрыялу. Рускі рэзавы і дакументальны матэрыял штучна адкідваўся. Такая-ж прэднамераная тэндэнцыёзнасць праводзілася і ў гістарычных работах. Так, тая-ж віленская група вучоных-гісторыкаў выпускае ў 1856 годзе „Збор актаў, касаючыхся Літвы з 1387 па 1710 год", а прафесар Даніловіч выдае „Скарбніцу грамат" „Skarbiec diplomatów". Абодва гэтыя выданні—яркі прыклад польскай ваінствуючай фальсіфікацыі гісторыі, якая імкнулася затушаваць роль беларускай культуры. Тут паказана палітычнае жыццё феадальных вярхоў, але дакументы, якія гавораць аб многаабразным жыцці беларускага і украінскага народаў, не дадзены зусім, і такім чынам чытачу ўнушаецца думка, што беларускай культуры і дакументаў на беларускай мове не існавала зусім. А між тым на беларускай мове пісаліс усе каралеўскія граматы Стэфана Баторыя, Сігізмунда III і Владзіслава IV, адрасаваныя ў Жмудзь, Заходнюю Беларусь і другія рускія землі.

Калі ў Беларусі і ў Літве ў XIV—XV вяках, а с XVI века і на Украіне, украінская феадальная знаць пачынае часткова паланізіравацца, пераходзіць у каталічаства, засмечвае родную мову паланізмамі, а ў афіцыяльных зносінах пачынае ўжываць лацінскую і польскую мовы, то значная частка рускай феадальнай знаці на Украіне супрацьўляецца націску польскай культуры і стойка трымаецца за родную мову і ў жыцці, і ў канцылярскіх актах. Так украінская шляхта Брацлаўскага ваяводства, атрымаўшы ад Стэфана Баторыя ў 1576 г. ліст на польскай мове, неадкладна пасылае каралю наступную заяву:

„Міласцівы кароль, парушаюцца нашы вольнасці і правы тым, што з канцылярыі Вашай... пасылаюцца да нас лісты, пісаныя польскім пісьмом. Пагэтаму мы просім Вашу каралеўскую міласць пакорнымі просьбамі на будучы час захаваць у цэласці прывілеі[1]) свабоды нашай, загадаўшы, каб нам з канцылярыі Вашай каралеўскай міласці прысылаемы былі лісты на рускай мове".

Але калі буйныя ўкраінскія феадалы і шляхта ў часткі сваёй дрогнулі і, стаўшы ізменнікамі сваёй народнасці, трапілі ў палон і пад уздзейнічанне польскай культуры, то мяшчанства, большая частка дробнай шляхты і ўсё беларускае і ўкраінскае сялянства засталіся вернымі сваёй роднай мове і сваёй народнасці. Падаўляючая большасць беларускага і ўкраінскага народаў доўга і упарта змагаецца з націскам паланізацыі і ўсяляк утрымлівае сваю культуру, звычаі і родную мову.

Польскія вучоныя не застанаўліваліся таксама і перад прамой фальсіфікацыяй і іскажэннем рускіх тэкстаў там, дзе іх змест біў па спесі і гонару польскай правячай вярхушкі. Так, напрыклад, польскія вучоныя, выдаючы на рускай і польскай мовах вельмі важнае сведчанне кніжніка XVII века Івана Казіміра Пашкевіча аб сіле, значымасці і ўсеагульнасці распаўсюджання рускай мовы, ісказілі выказванні важнейшых фактаў. І. К. Пашкевіч ў 1621 годзе пісаў аб рускай культуры:

„Польшча праявітае латынню, Літва-ж і Жмудзь — русчызнаю, без той нельга абыйсціс Польшчы, без гэтай (т. е. без рускай мовы) будзеш у Літве і на Жмудзі — быццам дурак. Дзякуючы лацінскай мове Польшча можа гаварыць. Літва-ж і Жмудзь без рускай мовы існаваць не могуць. Ведай, Русь, што твае словы разнесліся па ўсяму свету, радуйся, рускі, твае словы ніколі не знікнуць".

Польскія вучоныя пры друкаванні свядома выкінулі і ў польскім і ў рускім тэкстах словы: „без той нельга абыйсціся ў Польшчы, без гэтай будзеш у Літве — быццам дурак". Гэта было зроблена для таго, каб не зняважыць польскай нацыянальнай гордасці.

Польская вялікадзяржаўная вучонасць ігнаравала многалікія сведчанні аб беларускай і украінскай культуры у Літве і Польшчы. Так зусім не папулярны былі думкі летапісца М. Стрыйкоўскага, які пісаў:

„Брацец літовец... яны (гутарка ідзе аб рускіх. — А. Ввэдзенскі) не менш цябе вядомы, што пазнаць за імі вымушаны ўсе. Без іх ты не ў сілах утрымаць парадак у дзяржаве, бо рускія ў сваіх краінах іздрэўле. У карысць рускіх сведчанні пастараў. З іх-жа ўзнікла і Літва дзякуючы аднадушшу. Літва пасялілась у бацькаўшчыне рускіх".

Віленскі гурток польскіх вучоных у сваёй рабоце па знішчэнню беларускай культуры працягвае старую польскую традыцыю.

Іезуіты ў XVI — XVII вяках яшчэ больш бесцэрэмонна, цынічна

[1]) Дакумант з ізлажэннем прывілегій дваранства.

У дапамогу настаўніцтву Заходняй Беларусі

Навукова - Даследчы Інстытут школ Наркомасветы БССР у мэтах аказання дапамогі настаўнікам Заходняй Беларусі ў іх рабоце, падрыхтаваў да выдання рад работ. Выдаецца брашура аб вопыце работы настаўніцы, дэпутата Вярхоўнага Совета БССР, М. Прудніковай, якая азнаёміць настаўніцтва Заходняй Беларусі з пастаноўкай работы ў першых класах совецкай школы.

Акрамя гэтага будуць выданы брашуры: „Выхаваўчая работа ў школе", „XVIII з'езд Партыі і органы народнага выхавання", зборнік „Агульныя пытанні работы школ БССР", а таксама спецыяльны зборнік прысвечаны выкладанню гісторыі СССР у школе.

На нарадзе навуковых работнікаў Інстытута прынята рашэнне арганізаваць рад лекцый для настаўнікаў Заходняй Беларусі. (БелТА).

—:::—

Працоўныя Беластока рыхтуюцца да XXII гадавіны Кастрычніка

БЕЛАСТОК, 3 кастрычніка (ТАСС). Культурна-асветны аддзел Часовага Упраўлення приступіў да мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да XXII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі.

Для працоўных арганізуюцца даклады і гутаркі аб велізарных дасягненнях краіны соцыялізма, аб росквіце Совецкай Беларусі. На прадпрыемствах і ва ўстановах адбудуцца гутаркі, прысвечаныя ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы. Адбылася нарада мастакоў аб мастацкім афармленні горада і калон дэманстрантаў. На дзень свята радыёфіцыруюцца ўсе плошчы горада. У горадзе адкрываецца бібліятэка і спецыяльны магазін па продажы палітычнай і мастацкай літаратуры на рускай і беларускай мовах. Часовае Ўпраўленне запрашае на гастролі дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР.

—:::—

1110 чалавек працуе на гарадскіх дарожных работах

Быстрым тэмпам вядуцца гарадскія работы. Часовае Упраўленне, жадаючы палажыць канец беспрацоўю, дало распараджэнне весці гэтыя работы ў больш шырокім маштабе.

Па данным Акруговага тэхнічнага аддзела ў цяперашні час на гарадскіх дарожных работах (па данным на 3 кастрычніка) занята 1110 чалавек, прычым, лік гэты заўсёды і планамерна павялічваецца.

На работах па упарадкаванню і афармленню Леніёнавай вуліцы працуе 228 чалавек, на Тызенгаўзаўскай вул.—176 чалавек, у Тупалшках 102, на работах па выпраўленню тратуараў, рамонту маставых і т. п. працуе ў розных пунктах горада — 350 чалавек і т. д.

На гарадскім бетонным заводзе, які вырабляе пліты для тратуараў і выконвае іншыя цэментныя работы, лік рабочых павялічан з 20 да 38.

НОСИТЕЛИ ПРАВДЫ И КУЛЬТУРЫ

В селе и в городе, куда ни посмотрите,
Вокруг любого нашего бойца
Сбирается толпа, и возникает митинг,
И радостным вопросам нет конца.

— Скажите, а попы не могут воротиться?
— А праздники какие есть у вас?
— А у меня, как-раз, изволил сын родиться,
Куда мне заявлять о нем сейчас?

— А церкви есть у вас?—А вы не пьете водки?
— Портные вам нужны? — Нужны вам кузнецы?
И на любой вопрос уверенно и четко
Умеют отвечать советские бойцы...

Две девушки бойца застенчиво спросили:
— А дорого у вас берут за зуб вставной?
Ну, вот за свой вы сколько заплатили?
— Я не платил копеечки одной.

— А как же так?—Мне вставили бесплатно.
— Вы шутите! Бесплатно. Что за вздор!
— Сейчас я расскажу, и будет все понятно...
И завязался долгий разговор

Об армии, соцстрахе и о клубах.
О том, как в здравницах советских хорошо.
И наш боец, начавший речь от зуба,
До смысла Конституции дошел.

На маленьком, понятном всем примере
Он девушкам селянским показал,
Как мы для всех открыли к счастью двери
И как невидящим открыли мы глаза.

В селе и в городе, куда вы ни взгляните,
Вокруг любого нашего бойца
Сбирается толпа, и возникает митинг,
И радостным вопросам нет конца.

Над панской вотчиной, подавленной и хмурой,
Забрезжил свет звезды, сияющей в Кремле.
Носителями правды и культуры
Советские бойцы проходят по земле.

Вас. Лебедев-Кумач.

ЗАПАДНАЯ УКРАИНА. (Передано по телефону через Киев).

Задачы рабочых камітэтаў фабрык і заводаў

Радасныя дні ліквавання перажываюць зараз гарады, мястэчкі і вёскі Заходняй Беларусі.

Пакрыўшая сябе славай у барацьбе за справу працоўных, за радзіму соцыялізма доблесная Чырвоная Армія з чэсцю выканала свой інтэрнацыянальны абавязак і аказала працоўным Заходняй Беларусі дапамогу вызваліцца з-пад ігa польскіх паноў. Паўсямесна ў вёсках і мястэчках Заходняй Беларусі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі працоўныя сустракалі, як сваіх вызваліцеляў, з радасцю і шчасцем.

Выражэнне такой любві да Чырвонай Арміі ёсць выражэнне любві да ўсяго Совецкага Саюза і яго многанацыянальнага і многамільённага гераічнага народа. Працоўныя вызваленай ад цемры і галечы Заходняй Беларусі бязмежна ўдзячны Совецкаму Ўраду за яго мудрае рашэнне і шлюць ад усей глыбіні душы гарачае прывітанне вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну.

Пасля прыхода Чырвонай Арміі ў гарадах і мястэчках, на заводах і фабрыках пачалі арганізоўвацца рабочыя камітэты. Па сваёй ініцыятыве рабочыя і работніцы пачалі арганізоўвацца ў адзіныя арганізацыі, каб забяспечыць нармальную работу прадпрыемстваў і абараняць інтарэсы рабочых і работніц.

Амаль на ўсіх прадпрыемствах г. Вільно днямі адбыліся агульныя сходы рабочых калектываў. Упершыню за 20 год рабочыя і работніцы смела, радасныя і шчаслівыя, выходзілі на трыбуны і гаварылі аб справах на прадпрыемствах. Першыя словы ўдзячнасці ўсе выступаўшыя пасылалі сваёй вызваліцельніцы—Чырвонай Арміі.

Па-сур'ёзнаму і па-дзелавому падыходзілі рабочыя большасці прадпрыемстваў да выбараў сваіх камітэтаў. Людзей, якія няздольны абараняць інтарэсы рабочых, адводзілі з кандыдатаў на галасаванне ў склад рабочых камітэтаў. Як гаспадары свайго радаснага жыцця вырашалі рабочыя справы арганізацыі работы фабрык і заводаў.

На сходзе рабочых і работніц ільняной фабрыкі „Фіброза" выступаўшыя адзначалі, што ўладары фабрыкі не прымаюць рашучых мер, каб у бліжэйшыя дні пусціць фабрыку. Да гэтага часу не вядзецца загатоўка ільнотрасты. Рабочыя адзначалі, што ўладары фабрыкі проста не жадаюць забяспечыць работай калектыў фабрыкі, які ўжо знаходзіцца каля 3-х месяцаў без работы.

У сваей пастанове рабочыя фабрыкі патрабавалі ад гаспадароў неадкладна прыступіць да загатоўкі ільнотрасты і ў 3—4 дні забяспечыць пуск фабрыкі. Выбранаму на гэтым сходзе рабочаму камітэту прапанавана дапамагчы гаспадарам зараз-жа на поўны ход пусціць фабрыку ў работу.

Выбраныя на агульных сходах рабочыя камітэты фабрык і заводаў прыступаюць да практычнай работы. Многія з іх зусім правільна зразумелі свае задачы і пачалі арганізоўваць працу на прадпрыемствах.

Вось к прыкладу рабочы камітэт фабрыкі „Электрыт". Уся о некалькі дзён прайшло з дня яго выбараў, а камітэт падняў і паставіў на вырашэнне рад важных пытанняў, звязаных з нармальнай работай фабрыкі.

Рабочы камітэт фабрыкі выпрацаваў мерапрыемствы дапамогі гаспадару фабрыкі ў хутчэйшым пуску фабрыкі. Прадуманы і шляхі арганізацыі дапамогі рабочым і работніцам фабрыкі, культурнага абслугоўвання калектыва.

Але многія рабочыя камітэты, выбраныя на сходах рабочых і работніц прадпрыемств, да гэтага часу яшчэ не прыступілі да практычнай сваёй работы і не ведаюць, як яе трэба пачынаць. Арганізацыя рабочых камітэтаў справа новая і таму ім патрэбна паўсядзённая дапамога і кіраўніцтва ў рабоце.

Задачы выбраных на агульных сходах рабочых камітэтаў фабрык і заводаў састаяць у тым, каб забяспечыць неадкладную нармальную работу прадпрыемств. Трэба прыняць усе меры к таму, каб на працягу 1—2 дзён усе фабрыкі і заводы былі пушчаны ў работу.

Пяршейшым абавязкам кожнага рабочага камітэта з'яўляецца забяспечыць пуск свайго прадпрыемства. Рабочы камітэт павінен дэталёва вывучыць усе прычыны чаму не работае фабрыка ці завод. Выявіць прычыны, знайсці асноўны тормаз — гэта азначае навесці парадак на прадпрыемстве і забяспечыць усім рабочым і работніцам работу.

Трэба выкрываць і факты сабатажа асобных прадпрымальнікаў, якія свядома затрымліваюць пуск фабрыкі ці завода.

Да ўсіх тых, хто сабатуе і не наладжвае работы прадпрыемств і тэтым самым пазбаўляе работы сотні і тысяч рабочых, павінны ужывацца меры, указаныя ў пастанове Часовага Упраўлення Віленскай Акругі. Усім гэтым і павінны штодзённа займацца рабочыя камітэты фабрык і заводаў.

Вельмі важнае месца ў паўсядзённай рабоце рабочых камітэтаў павінна заняць абарона інтарэсаў рабочых і работніц ад нападаў асобных прадпрымальнікаў. Камітэты штодзённа павінны клапаціцца аб жыццёвых умовах, культурным абслугоўванні рабочых і работніц.

Пры актыўнай рабоце ўсіх камітэтаў на фабрыках і заводах забяспечыць нармальную работу прадпрыемств горада. Павесці рашучую барацьбу са спробамі сабатажу асобных гаспадароў, забяспечыць бесперабойную работу ўсіх фабрык і заводаў горада — такава неадкладная задача рабочых камітэтаў.

Віленскія кінотэатры ўчора і сёння

З прыходам Чырвонай арміі змянілася жыццё нашага горада. Вячэрняй парой на В. Пагулянцы можна бачыць масы працоўных. Тэатры, якія раней абслугоўвалі толькі польскіх паноў, зараз служаць працоўнаму насельніцтву горада.

Змянілі свой выгляд і віленскія кінематографы. Калі раней яны мелі нязначную колькасць наведвальнікаў толькі ў святочныя дні, то цяпер яны штодзённа перапоўнены даадказу, бо ў кінотэатрах дэманструюцца фільмы совецкай вытворчасці.

На працягу многіх год фільмы паказвалі жыццё багацеяў, „геройскія" учынкі бандытаў і падонкаў грамадства. Героем фільма быў дабрадушны памешчык, находчывы паліцыянт. Накапіць капітал, або ўкрасці вялікую манету — было высачайшым ідэалам, які навязваўся гледачу. Кожны працоўны паказваўся як машэннік, або злодзей.

Рабочыя, аб якіх гаварылася ў фільмах, гэта былі праступнікі, або „няверныя слугі" сваіх гаспод. Сяляне ў такіх фільмах жылі багата і спакойна, а адзіным іх клопатам было, як дапамагчы свайму суседу—памешчыку. Буржуазны фільм гаварыў рабочаму: імкніся стаць фабрыкантам, а селяніну: памешчык — гэта твой друг. Моладзі расказвалі аб лоўкіх амерыканцах, якія падаўляюць індэйцаў.

Некалькі год таму назад польская цэнзура прапусціла ў Вільно некаторыя совецкія фільмы з «урэзкай». Народ іх праглядаў з вялікім захапленнем. Кінотэатры былі перапоўнены, упершыню ў віленскіх кіно раздаваліся бурныя апладысменты. Упершыню фільмы гаварылі ім праўду. Панскія ўлады спалохаліся гэтай праўды і хутка быў выдан закон аб забароне дэманстрацыі совецкіх фільмаў.

Але так не доўга працягнулася. Краіна вызвалена ад панскага гнёту. І вось зноў загаварыла праўда з экранаў. Героем фільма стала жыццё, праўдзівае жыццё працоўных, жыццё светлае і творчае. Совецкія фільмы адкрылі забітыя азёры, якія вялі да вялікай праўды, упусцілі струмень свежага паветра, якое назаўсёды выгнала хлусню, затхлую атмасферу з нашых кінотэатраў.

І. Левін

—:::—

Цэнтралізацыя грамадскіх работ ў Віленскай акрузе.

Па рашэнню Часовага Ўпраўлення Гарадскі тэхнічны аддзел, ведаўшы грамадскімі работамі на тэрыторыі горада, перайменаван у Акруговы тэхнічны аддзел. У сувязі з гэтым у яго веданне пераходзяць таксама ўсе работы, якія вядуцца на правінцыі. Загадчык Акруговага тэхнічнага аддзела інжынер Енш наладжвае цяпер сувязь з грамадскімі, у першую чаргу, дарожнымі работамі на правінцыі.

і нагла змагаліся з культурай украінскага і беларускага народаў, выкарыстоўваючы для гэтага апарат панска-шляхецкай дзяржаўнай улады. Беларускі і ўкраінскі народы адказалі на іезуіцкае наступленне нянавісцю і барацьбой. Вось чаму ў 1569 годзе, калі польская каралеўская ўлада палічыла карысным „імпартыраваць" іезуітаў у Вільно, то гэта было зроблена пад пакровам вялікай тайны: іезуітаў вывезлі ў Вільно ў закрытай карэце, сакрэтна, акружаных з усіх бакоў узброенымі коннікамі, бо без гэтага народ не упусціў-бы іх у горад. Іезуіты правазгласілі сваю палітыку пад лозунгам: „Падстракаць рускіх супроць рускіх, каб яны знішчалі друг друга". (Іезэфовіч „Гісторыя іезуітаў").

Іезуіты, бышыя тварцамі Брэсцкай уніі 1596 года, старанна падтрымлівалі і распальвалі рэлігійныя раздоры паміж уніятамі і праваслаўнымі ў асяродзі рускага насельніцтва. З другога боку, іезуіты пад флагам прабуджэння нацыянальнай свядомасці літоўскага народа натраўлівалі літоўцаў на беларусаў, праводзілі масавыя чысткі бібліятэк, знішчалі беларускія і украінскія кнігі, грамілі царкоўныя і манастырскія архівы, спальваючы рускія архіўныя дакументы, указваючыя на самастойнае і дрэўняе паходжанне рускай культуры.

Асоба вызначыўшыеся ксяндзы, епіскапы і радавыя іезуіты на гэтым герастратавым попрышчы ўзнагароджваліся. Так, епіскап Акакій Грахоўскі, усё жыццё збіраўшы, адкрыта грабіўшы рускія дакументы і рускія кнігі для прэдання іх агню, быў шчодра ўзнагароджан каралём і папай. Ксёндз Б. Мацеёўскі за знішчэнне рускай літаграфіі і пагром архіваў Беларусі з рускім дакументальным матэрыялам атрымаў кардынальскую шапку. Епіскап Іосіф Залускі атрымаў буйнае Ванхацкае аббацтва, даваўшае вялікі даход, для таго, каб даць яму магчымасць трациць буйныя грашовыя сродкі на пакупку рускіх рукапісаў і кніг там, дзе ўкрасці іх было немагчыма. І Залускі паўпукай, кражай, вобысками і канфіскацыяй сабраў свой вядомы рукапісны і кніжны збор, пры чым многа рускіх рукапісаў было ім варварскі знішчана. Адам Нарушэвіч, Осіп Оссалінскі ў 1790 годзе, Фадзей Чацкі і Ліндэ таксама збіралі і палілі беларускія і ўкраінскія рукапісы і кнігі.

Упарта змагаліся з беларускай культурай і польскія магнаты. Адзін з князей Радзівілаў, па празванню „Сіротка", затраціў агромную суму грошай на атрыманне спецыяльна для спальвання помнікаў украінскай і беларускай пісьменнасці. Другі князь Радзівіл — гетман Януш Радзівіл, узяўшы ў жніўні 1651 г. на кароткі, між іншым, час Кіеў, спаліў увесь Падол, знішчыў і прэдаў агню і саборную Успенскую царкаў на Падоле іменна таму, што тут трымаліся з даўніх часоў мноства дрэўніх грамат рускіх князей і кіеўскія актавыя кнігі на рускай мове.

З гэтага асяроддзя няўставых і фанатычных палачызатараў, з каталіцкага духавенства, магнатаў і шляхты выходзілі многалікія фальсіфікатары і майстры падлогаў гістарычных дакумантаў. Праявчае асяроддзе польскіх паноў прыбягала да падлогаў і фальсіфікацыі дакумантаў як для падтрымання дастоінства і чэсці шляхты ў тых выпадках, калі нехапала подлінных дакумантаў, так і ў многалікіх выпадках для легалізацыі гвалтоўных, неправамерных зямельных захопаў сялянскіх зямель на Украіне і ў Беларусі. Феадальнае права — кулачнае права, і адным з відаў юрыдычных ухішчрэнняў гэтага права былі падлог і фальсіфікацыя гістарычных дакумантаў.

Калі польская дзяржаўнасць абанкроцілася ў XVIII стагоддзі і Польшча як самастойная дзяржава перастала існаваць, мноства палякаў — лавачнікаў і авантурыстаў стала ўпаўзаць у рады рускага дваранства.

Размнажэнне палякаў - дваран пашло з быстрынёй мікробаў. У 1861 г. у Беларусі і Літве лічылась 377.127 дваран-паноў, у той час як па дзесятай рэвізіі (1856 — 1858 г.г.) лік усіх дваран Расійскай імперыі раўняўся 232.446. Такім чынам, у Беларусі ў дваранстве лічылась 3,56 проц. да ўсяго насельніцтва а ва ўсёй Расіі дваране складалі 0,48 проц. усяго насельніцтва. Не дзіва, што гэта маса паноў-памешчыкаў і ў XIX і ў XX стагоддзі абеззямельвала беларускае і ўкраінскае сялянства і праследавала рускую культуру ўсюды.

У польскіх памешчыцкіх кругах XVIII і XIX вякоў была вядома запіска („Prosut") аб іскарэненні рускай культуры, зрабіўшаяся настольнай кнігай польскіх памешчыкаў. Тут указвалася, што мяцежныя элементы, падымаючыяся ў сялянска казацкіх паўстаннях супроць панскай эксплаатацыі, — беларусы і ўкраінцы непахісны ў разуменні сваёй рускай народнасці. Руская мова і рускія звычаі, казалась у запісцы, прадстаўляюць смяротельную небяспеку для пана-памешчыка, для ўсяго шляхецтва. Селянін, які ўмее чытаць рускую кнігу,—рэзерв паўстанцаў і ненахісных у сваёй нянавісці к палякам мяцежнікаў. Патэтаму памешчыкам трэба безумоўна забараніць абучацца рускай грамаце. І шляхта, паны-памешчыкі, натхняемыя кругам ідэй гэтай мракабеснай кніжкі, сталі загадваць у сваіх інструкцыях эканомам і ўпраўіцелям маёнткаў, каб яны строга глядзелі за тым, „каб сялянскія дзеці займаліся не кнігамі, а плугам, сахою, бараною, цэпам".

Нічаму не навучыўшыся ў гісторыі, паны і ў 1919—39 гг., таксама, як і на працягу многіх вякоў, праследвалі народную культуру ў Заходняй Беларусі, у Заходняй Украіне, трымаючы, як і раней, у цемры і невежастве народныя масы, закрываючы школы, забараняючы родную мову, разграмляючы культурныя ачагі, абракаючы працоўных на голад і жабрацтва.

Прышоў канец многавяковым пакутам народных мас Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Народы-браты вызвалены вялікай вызваліцельніцай — совецкай Чырвонай Арміяй. Працоўным у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, якім вякамі прыходзілася жыць, умываючыся слёзамі, прадстаіць цяпер новае, шчасливае і радаснае жыццё.

Праф. А. Введзенскі.

„Известія" ад 27 верасня.

ЗА РУБЯЖОМ



З прыходам Чырвонай Арміі ажылі гаралы Заходняй Беларусі. Адноўлен па адак і ў гор. Вільно. На здымку: рабочагвардзеец рэгуліруе вулічным рухам.

Фото Сапіра.

Праект пабудовы гідраэлектрычнай станцыі ператвараецца ў сапраўднасць

Шмат год падрад віленскае гарадское самаўпраўленне разглядала праект аб пабудове на Віліі ў раёне Турнішак вялікай гідраэлектрычнай станцыі, якая дастаўляла-б дзяшовую электрычную энергію для г. Вільно, для асвятлення кватэр і для прамысловых мэт. Станцыя гэтая разлічана была таксама на дастаўку электраэнергіі для правінцыі.

Да гэтага часу работы праводзіліся марудным тэмпам. Цяпер Акружны будаўнічы аддзел Часовага Управлення пашоў па лініі хуткай рэалізацыі гэтага праекта. Работа па будаўніцтву вялікай плаціны на рацэ Віліі ў Турнішках вядзецца хуткім тэмпам. У Турнішках працуе 450 чалавек, прычым, лік гэты будзе на працягу бліжэйшых дзён павялічан. Каштоўнасць будаўніцтва вызначана ў 14 мільёнаў рублёў.

Першыя транспарты беластокскай мануфактуры ў Вільно

Наладжваецца гандлёвая сувязь паміж Вільно і Беластокам. На працягу двух мінуўшых дзён у Вільно прыбыло некалькі транспартаў суконных тавараў з беластоцкіх фабрык, якія з прыходам у гэты прамысловы цэнтр часцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі значна павялічылі сваю прадукцыю.

Адбудова віленскай радыёстанцыі

Пасля прыхода ў Вільно часцей Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, Часовае Управленне неадкладна прыступіла да аднаўлення работы радыёстанцыі.

Пашкоджанні станцыі аказаліся вельмі вялікімі, бо акрамя бомб цёмныя элементы скарыстаўшы хаос, які панаваў у горадзе перад прыходам часцей Чырвонай Арміі, частку машын, у асаблівасці медныя часткі расцягнулі.

На работах па рэстаўрацыі станцыі занята 35 чалавек. Работы вядуцца паскоранымі тэмпамі. Работа па ачышчэнню машын ад смецця і абломкаў будзе закончана к канцу гэтага тыдня, пасля чаго пачнецца мантаж машын. Тэхнічныя часці знішчожанага абсталявання будуць дастаўлены з Масквы.

Цэмент з Валкавыска.

У бліжэйшыя дні ў Вільно прыбудзе вялікі транспарт цэмента з валкавыскага цэментнага завода „Рось“. Цэмент гэты прадназначаецца часткова для гарадскога бетоннага завода, часткова для будаўніцтва водна-электрычнай станцыі на Віліі.

Замежны друк аб мірнай палітыцы СССР

Эстонія

ТАЛІН, 3-га кастрычніка (ТАСС). Эстонскі правінцыяльны друк шырока каментыруе пакт аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй, а таксама ратыфікацыю пакта Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР і Прэзідэнтам Эстонскай рэспублікі. Газета „Сакала“, якая выходзіць у горадзе Вільяндзі, асабліва адзначае радушны прыём, які быў аказан у Маскве міністру замежных спраў Эстоніі Сельтэру. Газета адзначае ўдзел у перагаворах таварыша Сталіна. Газета „Выруама театал“, якая выходзіць ў горадзе Раквела, таксама друкуе падрабязныя інфармацыі аб пакце.

Буйная правінцыяльная газета „Элу“, абслугоўваючая паўднёвую Эстонію піша, што Совецкі Ўрад аказаў вялікую чэсць эстонскай дэлегацыі і ў яе асобе ўсяму эстонскаму народу.

Шырока адклікаецца на ратыфікацыю дагавора таксама выходзячая ў горадзе Курэсара (востраў Сэарэма) газета „Мейе маа“.

Латвія

РЫГА, 4 кастрычніка (ТАСС). Учора газеты надрукавалі паведамленні аб прыездзе латвійскай ўрадавай дэлегацыі ў Маскву і аб гутарцы міністра замежных спраў Латвіі Мунтэрс з т. т. Сталіным і Молатавым. Грамадзкая думка з нецярпеннем чакае вынікаў перагавораў у Маскве.

Віднае месца ў сённешніх газетах вылзелена паездцы літоўскай ўрадавай дэлегацыі ў Маскву па запрашэнню тав. Молатава. У паведамленнях з Каўнаса газеты падкрэсліваюць выключна дружаственны характар запрашэння, якое зроблена совецкім урадам ураду Літвы.

РЫГА, 4 кастычніка (ТАСС). Газета „Латвіяс Карэйвіс“ ў аглядзе міжнародных падзей перадае змест дагавора паміж Германіяй і СССР. Газета асабліва падкрэслівае, што СССР і Германія лічаць вайну бессэнсоўнай і што ва Ўсходняй Еўропе мір аднаўлен і абедзве вялікія дзяржавы не дапусцяць умяшацельства трэцяй дзяржавы. Далей газета адзначае, што з усіх падзей нас найбольш цікавіць пакт аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй. Дзякуючы атрыманым новым ваенна-марскім і паветраным базам СССР забяспечвае безапаснасць на выпадак, калі ў яго ўзнікне ўзброены канфлікт з якой-небудзь вялікай дзяржавай. Такім чынам ва ўсім басейне Балтыйскага мора ствараецца новае палажэнне.

—:::—

„Хельсінгін Саномат“ аб становішчы Балтыйскіх краін

ХЕЛЬСІНКІ, 4 кастрычніка. (ТАСС). „Хельсінгін Саномат“ апублікавала пералавы артыкул пад загалоўкам: „Становішча Балтыйскіх краін“.

— Дасягнутая з Германіяй пагадненне, — піша газета, — дае Совецкаму Саюзу магчымасць перастроіць свае адносіны з Балтыйскімі краінамі.

Пытанне аб гарантыях Балтыйскім краінам, якое іграла настолькі значную роль ў часе англа-франкасовецкіх перагавораў цяпер ажыццяўлёна. Форма гэтага ажыццяўлення ўсіляе таксама той мінімум небяспекі „ускоснай агрэсіі“ праз Балтыйскія краіны. Зварачвае на сябе ўвагу паслядоўнасць знешняй палітыкі СССР. Замест абходнага шляху знойдзен просты і гладкі шлях“.

Дазвол Масціцкаму на ўезд у Швейцарыю

ПАРЫЖ, 4 кастрычніка (ТАСС), Швейцарскі ўрад дазволіў уезд у Швейцарію былому польскаму прэзідэнту Масціцкаму і яго жонцы, знаходзячымся цяпер у Бухарэсце. Як павядамляе агенцтва Гавас, Масціцкі „з‘яўляецца швейцарскім грамадзянінам з 1908 года. Ён мае ў Швейцарыі нерухомую ўласнасць“.

Выступленне Чэмберлена ў палаце абшчын

ЛОНДАН, 4 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе па радыё, што ўчора ў палаце абшчын выступіў прэм‘ер Чэмберлен.

На працягу апошняга тыдня, — заявіў Чэмберлен,—у вобласці міжнародных адносін адбыліся падзеі вялікай важнасці. 27 верасня Рыбентроп наведаў Маскву і 28.IX былі апублікаваны рэзультаты гэтага візіта. „Германскі і совецкі ўрады,— сказаў Чэмберлен, — заявілі, што дасягнутае імі пагадненне канчаткова вырашае пытанні, выцякаючыя з краха Польшчы і стварае крэпкія а новы для працяглага міра ва Усходняй Еўропе. Па іх думцы ліквідацыя цяперашняй вайны паміж Германіяй і Англіяй і Францыяй будзе ў інтарэсах усіх нацый. Абодва ўрады заявілі, што яны паспрабуюць дасягнуць гэтай мэты як мага хутчэй“.

Напомніўшы аб сумеснай совецка-германскай заяве аб адказнасці і Францыі за працягжэнне вайны і аб германа-совецкіх кансультацыях, Чэмберлен сказаў: „У некатарых кругах патрабуюць, каб англійскі ўрад вызначыў сваю пазіцыю. Але ў тым, што здарылася я не бачу нічога, што прымусіла-б Англію змяніць сваю пазіцыю, якую яна лічыць у праве займаць“.

Закранаючы прапанову аб сканчэнні вайны, Чэмберлен заявіў, што ён не можа прадугадваць, якога характара могуць быць такія прапановы. Калі такія прапановы будуць зроблены, урад зможа іх разглядзець і вывучыць. Разам з тым Чэмберлен падкрэсліў, што ўрад намеран прадаўжаць вайну да таго часу, пакуль не будзе дасягнута задача, якую ён перад сабой паставіў.

Далей Чэмберлен застанавіўся на ітогах ваенных дзеянняў за мінулы тыдзень. „На заходнім фронце, — заявіў ён, — французскія войскі адзяржалі далейшыя поспехі, якія далі ім магчымасць заняць выгадныя пункты для назірання за германскімі пазіцыямі. Крупная англійская экспедыцыйная армія перавезена ва Францыю і зараз распалагаецца побач з нашымі французскімі саюзнікамі. Нашы самалёты, распаложаныя ва Францыі, робяць разведвацельныя палёты, як ноччу, так і днём, і ўступаюць у сутычкі з варожымі самалётамі. Берагавая паветраная ахова прадаўжала на працягу гэтага тыдня сваю барацьбу з падводнымі лодкамі, а таксама патрульную і эскортную службу. Выкарыстоўваючы лунную надвор‘е, яна прадаўжала бязлітасную барацьбу з падводнымі лодкамі і ў начны час. Было заўважана некалькі германскіх падводных лодак, каторыя падвергліся нападу“.

—:::—

Заява Цэнтральнага Камітэта англійскай компартыі.

ЛОНДАН, 4 кастрычніка (ТАСС) У звязку з учорашнім выступленнем Чэмберлена ў палаце абшчын Цэнтральны камітэт комуністычнай партыі Англіі апублікаваў заяву, у якой указваецца, што Чэмберлен са ўтаенай варожасцю эдносіцца да прапаноў аб тым, каб англійскі ўрад адзначыў свае адносіны да мірных прапановаў, якія магчыма паследуюць у рэзультаце нядаўнага совецка-германскага пагаджэння.

„Заява Чэмберлена аб тым, што ўрад разгледзіць любую прапанову, суправаджалася такой колькасцю агаворак, што няма ніякага сумнення ў тым, што мірныя прапановы, які-б характар яны ні мелі, сустрэнуць з боку ўраду крайне варожы прыём“.

У заяве ЦК англійскай компартыі ўказваецца, што новыя акалічнасці, узнікшыя за апошнія дні, адкрылі вялікія магчымасці для міра і безапаснасці. „Вайне ва Усходняй Еўропе, — гаворыцца ў заяве, — быў паложан канец. Ініцыятыва Совецкага Саюза вызваліла народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Раней прыгнечаныя народы ўсходняй часці Польшчы ўжо атрымалі нацыянальнае і социяльнае вызваленне, якога яны не ведалі за час усёй сваёй гісторыі. Яны не хочуць аднаўлення ўзначаленай Бэкам машыны прыгнечання. Прадаўжэнне вайны ў Заходняй Еўропе, — гаворыцца далей у заяве, — прадстаўляе смяртэльную небяспеку для інтарэсаў народаў усіх краін. Рэакцыянеры-імперыялісты Англіі і Францыі накіроўваюць галоўныя ўдары супроць народаў сваіх краін, супроць жыццёвага ўзроўня народа, супроць рабочага руху і супроць дэмакратычных ладаў.

Мы патрабуем, — гаворыцца ў заключэнне, — зараз-жа пачаць перагаворы аб устанаўленні міра ў Еўропе. Мы патрабуем зараз-жа прадпрыняць меры супроць спэкуляцыі. Мы патрабуем панізіць цэны на прадметы першай неабходнасці, павысіць заработную плату, пенсіі і дапамогі беспрацоўным і знішчыць беспрацоўе. Мы заклікаем скончыць з супрацоўніцтвам кіраўнікоў рабочага руху з урадам вайны і ворагаў народа.

—:::—

Выступленне міністра замежных спраў Японіі

Японскі друк паведамляе, што на канферэнцыі губернатараў з дакладам аб становішчы ў Еўропе і знешняй палітыцы Японіі выступіў міністр замежных спраў Японіі адмірал Номура.

У пачатку свайго даклада Номура заявіў, што цяперашні ўрад Японіі з прычыны змен, якія адбыліся ў Еўропе за апошні час, рашыў адмовіцца ад палітыкі ўмацавання антыкомінтэрнаўскага пакта. Спыніўшыся на развіцці вайны ў Еўропе, Номура сказаў, што ніхто не можа цяпер прадсказаць, да якіх рэзультатаў яна прывядзе, але хутчэй усяго, — заўважыў ён, — гэта будзе працяглая вайна.

Гаворачы аб пазіцыі Японіі, міністр указаў, што „нацыянальная палітыка Японіі нязменна будзе накіравана на вырашэнне кітайскіх праблем“. (ТАСС).

—:::—

Страты японцаў у Кітаі

Згодна паведамленням з кітайскіх ваенных крыніц, за другую палавіну верасня на ўсіх фронтах у Кітаі адбылося 337 баёў. У час гэтых баёў японцы страцілі забітымі і раненымі 18.216 чалавек. Кітайцамі ўзяты ў палон 328 японскіх салдат і афіцэраў. Акрамя таго, кітайцамі захоплена многа зброі і боепрыпасаў, знішчана 87 японскіх танкаў і бронемашын. Патоплена 80 японскіх ваенных суднаў рознага тыпу. (ТАСС)

—:::—

Прапанова французскіх комуністаў-дэпутатаў парламента.

БРУСЕЛЬ, 4 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва „Бельга“ паведамляе з Парыжа, што комуністычная фракцыя французскага парламента, якая носіць цяпер назву партыі рабочых і сялан, звярнулася з пісьмом да старшыні палаты дэпутатаў Эрыо, у якім прапануе паставіць на абгаварэнне парламента пытанне аб праблеме міра. У звязку з апублікаваннем гэтага пісьма буржуазны друк патрабуе ад урада пазбаўлення комуністаў дэпутацкіх паўнамоцтваў і прыняцця супроць іх строгіх санкцый.

—:::—

Канфіскацыя маёмасці французскай компартыі

БЕРЛІН, 4 кастрычніка (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ўся маёмасць комуністычнай партыі Францыі канфіскавана французскімі ўладамі і распрадаецца з малатка. Адначасова паведамляецца, што французскія профсаюзы выключылі комуністаў са склада праўленняў профсаюзаў.

Распараджэнне № 1. Адміністрацыйнага аддзела Часовага Упраўлення г. Вільно

Адміністрацыйны аддзел Часовага Упраўлення горада Вільно і Віленскай акругі абавязвае ўсіх уладароў гасцініц, начлежных дамоў, інтэрнатаў і т. д. 5—6 кастрычніка г. г. з‘явіцца ў штаб Рабочай Гвардыі (Свенцянская вул., 3) са спісамі:

а) Часова пражываючых грамадзян, прыбыўшых у гор. Вільно па службовым або асабістым справам.

б) Пастаянна пражываючых грамадзян, якія не маюць кватэр у горадзе.

в) Адміністрацыі і абслугоўваючага персанала гасцініц.

Спісы скласці па форме:

1) Нумар па парадку.

2) Прозвішча, імя і імя па бацьку.

3) Год і месца нараджэння.

4) Дзе раней пражываў.

5) Быўшае месца працы і пасада.

6) З якога часу пражывае ў гасцініцы або інтэрнаце.

7) Прычыны пражывання.

Сумесна з кнігамі ўчота пражываючых у гасцініцы прадставіць Штабу Рабочай Гвардыі асабістыя дакументы пражываючых (пашпарты, даведкі або воінскія білеты).

З 6 кастрычніка 1939 г. уводзіцца наступны паралак прапіскі пражываючых у гасцініцах або інтэрнатах:

Прыбываючы ў гасцініцу грамадзянін запаўняе анкету ў 2-х экзэмплярах, якую сумесна са сваімі асабістымі дакументамі здае дзяжурнаму адміністратару.

Кожны грамадзянін на працягу 12 гадзін павінен быць прапісан у Штабе Рабочай Гвардыі і атрымаць на дакументах візу Штаба Рабочай Гвардыі.

Гэты-ж паралак распаўсюджваецца і на прыватныя дамы, дворнікі або ўладары якіх павінны праводзіць рэгістрацыю прыбыўшых на часовае жыхарства ў Батальёнах Рабочай Гвардыі (быўшых камісарыятах), дастаўляючы дамавыя кнігі з занесенымі ў іх часавымі жыхарамі.

Невыкананне гэтага распараджэння адміністрацыяй гасцініц, дворнікамі, уладарамі дамоў, а таксама асобамі, прыбываючымі на часовае жыхарства ў горад Вільно—будзе разглядацца, як свядомае ухіленне ад пашпартнага рэжыму.

Віноўныя ў нарушэнні гэтага распараджэння будуць прыцягнуты да адказнасці.

Начальнік Адміністрацыйнага аддзела Часовага Упраўлення горада Вільно і Віленскай акругі.

Палкоўнік **Петроў.**

Начальнік Штаба Рабочай Гвардыі

Палкавы камісар **Прэдко.**

4 кастрычніка 1939 г.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Адрас рэдакцыі і друкарні: вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.